Інфармацыйны ліст № 1

**Паважаныя калегі!**

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі запрашае Вас прыняць удзел у працы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі

**«Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2025 годзе»**

Асноўныя накірункі працы канферэнцыі:

1. Археалагічныя даследаванні помнікаў каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.
2. Археалагічныя даследаванні помнікаў эпохі Сярэднявечча і Новага часу.
3. Ахоўныя мерапрыемствы ў зонах земляных і будаўнічых работ, інвентарызацыя помнікаў археалогіі.
4. Вынікі камеральных даследаванняў і рэстаўрацыйных мерапрыемстваў.
5. Захаванне археалагічнай спадчыны. Практычны і тэарэтычны вопыт рэагавання, прафілактыкі і барацьбы з супрацьпраўнай дзейнасцю па пошуку/абмену/гандлю археалагічнымі артэфактамі і пашкоджаннямі/знішчэннем археалагічных аб'ектаў.

**Тэрмін правядзення канферэнцыі:** 28 – 30 красавіка 2026 г.

**Месца правядзення канферэнцыі:** пленарнае пасяджэнне – г. Нясвіж; праца секцый – г. Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Трансфер па маршруце г. Мінск – г. Нясвіж – г. Мінск за кошт арганізатараў канферэнцыі.

**Форма даклада** – вусная, стэндавая.

Прыняць удзел у працы канферэнцыі можна як вочна, так і online.

**Рэгламент выступленняў:** на пленарным пасяджэнні – да 20 хвілін, на секцыях – да 15 хвілін, прадстаўленне стэндавага дакладу – да 3 хвілін.

**Працоўныя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, ангельская.

Тэрмін падачы заяўкі ў аргкамітэт: **да 3 красавіка 2026 г.**

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца ў **рэжыме online** ці па QR-коду. Тэзісы дакладаў (да 3 тыс. знакаў) прымаюцца **да 3 красавіка 2026 г.** у электронным выглядзе на адрас polevaja.conference@yandex.by. Зборнік тэзісаў дакладаў будзе надрукаваны да пачатку працы канферэнцыі.

Тэзісы дакладаў павінны мець наступную структуру: назва, аўтар/аўтары, ключавыя словы (3-5 слоў), тэкст, які раскрывае змест працы, праблемы аб’екта, мэты, асноўныя метады і галоўныя вынікі. Усе атрыманыя матэрыялы пройдуць навуковае рэцэнзаванне, па выніках якога **Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў, а таксама пераносу часткі з іх у стэндавую форму.**

Камандзіровачныя выдаткі ўдзельнікаў канферэнцыі ажыццяўляюцца за кошт камандзіруючага боку.

З павагай,

Арганізацыйны камітэт канферэнцыі

Інфармацыйны ліст № 1

Правілы для аўтараў тэзісаў дакладаў
міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
**«Вынікі археалагічных даследаванняў
на тэрыторыі Беларусі ў 2025 годзе»**

Аб’ём тэзісаў, улічваючы тэкст і спіс літаратуры, – 3 тыс. знакаў з прабеламі.

Структура і змест тэзісаў:

– назва, набраная малымі літарамі (вялікія літары выкарыстоўваюцца згодна з правіламі арфаграфіі);

– імя і прозвішча для кожнага з аўтараў;

– ключавыя словы (3-5 слоў);

– уводзіны;

– апісанне аб’екта даследавання;

– вызначэнне мэты і пастаноўка задач;

– асноўная частка (апісанне даследавання);

– заключэнне/высновы;

– літаратура і крыніцы.

Спіс літаратуры і крыніц афармляецца ў парадку прастаўлення спасылак у тэксце ў адпаведнасці з патрабаваннямі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (https://vak.gov.by/be/node/8026).